**А. Я. Паўлава**

# ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ЗАСЛУЖАНАГА АРХІТЭКТАРА БССР В. М. ВОЛЧАКА

Заслужаны архітэктар БССР В. М. Волчак з’яўляецца аўтарам і сааўтарам некалькіх помнікаў і мемарыяльных комплексаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны, на тэрыторыі Беларусі. Між тым знакаміты

архітэктар-мастак, які так яскрава адлюстраваў падзеі ваеннага ліхалецця, нарадзіўся далёка ад беларускай зямлі, у Краснаярскім краі. У Беларусь Віктар Мацвеевіч прыехаў пасля вайны, у 1953 г.

Аднак некаторыя сувязі В. М. Волчака з беларускімі архітэктарамі, якія маглі пасадзейнічаць яго пераезду ў Мінск, мы можам знайсці ў пачатковым перыядзе яго творчасці. У 1929 г. Віктар Волчак быў накіраваны на вучобу ў Маскву ў Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут (ВМАТЭІН). Пасля рэарганізацыі гэтай ВНУ частку студэнтаў перавялі ў Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры (В. М. Волчак у сваіх успамінах называў Ленінградскую акадэмію мастацтваў). Аднакурснікам В. Волчака быў Г. Заборскі. Кіраўніком дыпломнага праекта стаў прафесар Іосіф Лангбард.

Летам 1941 г. архітэктар знаходзіўся ў Ташкенце, дзе працаваў пасля заканчэння ВНУ. Архітэктар-мастак у гэты перыяд змагаўся супраць ворага даступным яму спосабам – сілай плакатнага мастацтва. Так, вядомы ягоны плакат “Вучыся абараняць Радзіму!”. У БДАМЛМ захоўваецца тыражны плакат В. М. Волчака “Фашызм – гэта гвалт, голад, смерць” (1941).

Аднак, як і большасць насельніцтва СССР, В. Волчак жадаў абараняць краіну са зброяй у руках. У жніўні 1941 г. ён быў мабілізаваны. Пасля заканчэння шасцімесячных курсаў Ваенна-інжынернай акадэміі імя У. Куйбышава і Болшаўскага ваенна-інжынернага вучылішча ў званні старшага лейтэнанта Віктар Волчак быў накіраваны ў дзеючую армію намеснікам камандзіра асобнага сапёрнага батальёна ў дывізію, якая абараняла Сталінград. Сярэдняя працягласць жыцця байца на гэтым участку фронту была тры дні. На момант прыбыцця В. Волчака на месца службы камбат загінуў, і неабстрэленаму намесніку прыйшлося прымаць камандаванне на сябе [1, арк.7–10]. Як прыгадваў сам архітэктар пасля вайны, ён правёў тры гады ў дзеючых войсках: франтавымі дарогамі прайшоў ад Сталінграда праз Курскую дугу да вызвалення Чэхаславакіі. Восенню 1943 г. у перыяд падрыхтоўкі і фарсіравання Дзясны і Дняпра пад інтэнсіўным агнём праціўніка ён забяспечваў ажыццяўленне пераправ з дапамогай падручных сродкаў і падсобных матэрыялаў. Ідучы ў авангардзе баявых парадкаў, ажыццяўляў фатаграфаванне і замалёўкі адбітых у праціўніка збудаванняў і перашкод, вывучаў спосабы іх пераадолення савецкімі войскамі. Вызваляў поўдзень Беларусі, Украіну, Польшчу, Усходнюю Германію і Чэхаславакію.

Падчас баёў у 1944 г. В. Волчак атрымаў раненне і трапіў у рэзерв. Заўважыўшы ў шпіталі, што афіцэр-сапёр (на той момант начальнік штаба сапёрнага батальёна 10-й стралковай дывізіі) шмат малюе, прадстаўнікі палітаддзела 60-й арміі 1-га Украінскага фронту забралі сапёра з мастацкай акадэмічнай адукацыяй у рэдакцыю газеты “Армейская праўда”. Акрамя карэспандэнцкай работы В. Волчаку даручылі пісаць гісторыю баявога шляху 60-й арміі і вывучэння вопыту вайны [1, арк.10–11].

Вайну Віктар Мацвеевіч скончыў у званні капітана ў Празе. За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне В. М. Волчак быў узнагароджаны медалямі “За баявыя заслугі”, “За адвагу” і Ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені.

У красавіку 1953 года па запрашэнні А. В. Караля Віктар Мацвеевіч пераехаў працаваць у Мінск галоўным архітэктарам праектаў Інстытута “Белдзяржпраект”.

Асабісты архіўны збор В. М. Волчака захоўваецца ў БДАНТД, куды яго перадаў сын архітэктара. Матэрыялы фонду архітэктара-мастака, якія маюць дачыненне да падзей ваеннай пары, можна падзяліць на некалькі групп.

Асобная група – гэта матэрыялы, якія былі створаны падчас ваенных падзей. У асабістым архіўным зборы архітэктара захаваліся альбом франтавых малюнкаў (28 аркушаў) [2] і падборка франтавых заметак (29 аркушаў) [3]. Часам В. Волчаку прыходзілася вырабляць друкарскае абсталяванне з падручных матэрыялаў (напрыклад, гравюры ствараліся на аснове садранага з падлогі ў пустой кватэры лінолеума). Адна з такіх гравюр захавалася ў зборы архітэктара ў БДАНТД [3, арк. 1].

У прадмове да франтавых малюнкаў Віктар Мацвеевіч адзначаў: “Калі маляваў, то не думаў, што малюнкі захаваюцца, і я змагу на іх зноў паглядзець праз многія гады і нават паказаць унукам. Будучы [на вайне] сапёрам, а не мастаком-прафесіяналам, я звяртаўся да малюнкаў як сродку адцягнуцца ад турбот франтавога жыцця. Многія ветэраны, якія вярнуліся да мірнага жыцця, прывезлі ў сваіх целах жалезныя напамінкі пра ваеннае ліхалецце – асколкі і кулі. Мне пашанцавала. Акрамя шрамаў ад лёгкага ранення і кантузіі жалезных напамінкаў ва мне няма. Затое ёсць малюнкі, якія не менш за асколкі выклікаюць з памяці ўспаміны. Для мяне гэтыя малюнкі – ажыўшыя баявыя сябры пасля баёў і ў шпіталі. Я іх не толькі бачу, я прыгадваю іх характары, хваляванні і аповеды. Зараз гэта не проста малюнкі, а ўжо дакументы, блізкія да пасведчання ўдзельніка вайны. Няма сэнсу шукаць ў іх дасканаласць выяўленчага мастацтва, яны дарагія нам як старонкі франтавых дзённікаў” [2, арк. 1].

У альбоме прадстаўлены графіка на тэмы хуткага наступлення Чырвонай арміі і разгрому гітлераўскіх войскаў у “катлах”, партрэты-замалёўкі салдат і афіцэраў, а таксама супрацоўнікаў шпіталя. У падборцы прысутнічаюць карыкатуры на салдат вермахта, малюнкі ўсеянай забітымі мірнымі жыхарамі пасля адыходу нацыстаў выпаленай і разрабаванай роднай зямлі.

Сярод гэтых матэрыялаў ёсць і чатыры эсэ-замалёўкі, напісаныя для газеты “Армейская праўда”. Так, галоўным героем эсэ “Пужаная варона і куста пужаецца” стаў сяржант па прозвішчы Жэрдь, якому салдацкая кемлівасць дапамагла пры мінімуме выкарыстаных патронаў захапіць у палон трох гітлераўскіх афіцэраў. Артыкул “Гадзіннік” распавядае аб тым, як франтавая традыцыя “махнём не гледзячы” ледзь не прывяла байца Назурлана Нусхора да трагедыі: напярэдадні сустрэчы з В. Волчакам у штабе стралковага корпуса баец абмяняў свой паламаны гадзіннік на сутачны ўзрыўны механізм у шпіёна-дыверсанта. Сапёр В. Волчак на адно імгненне ўбачыў у кішэні гімнасцёркі байца вялікі гадзіннік і зразумеў, якая небяспека пагражае ўсім, хто знаходзіўся ў памяшканні штаба. В. Волчак імгненна прафесійна выхапіў гэты “гадзіннік” і выкінуў яго ў акно. Галоўныя персанажы артыкула “Фон

Дытрых” – два палонныя нямецкія салдаты фольксштурма – пажылы майстар па настройцы друкавальных машынак і “апрацаваны” гебельсаўскай прапагандай сын аднаго з высокіх чыноў гітлераўскай арміі. І паводзіны ў іх розныя: прадстаўнік мірнай прафесіі на допыте адразу прапанаваў адрамантаваць друкавальную машынку, а падлетак дэманстраваў адданасць рэйху.

Але больш за ўсё ўражвае эсэ ”Музыка бывае рознай” – пра дачку расійскага памешчыка Венцэносцава, якая пасля эміграцыі бацькоў на Захад у віхуры рэвалюцыйных падзей аказалася ў польскім горадзе Ланцут і сустрэлася з суайчыннікамі зімой 1945 г. Яе муж, ураджэнец Польшчы, загінуў у Асвенцыме. Байцы інжынернай разведкі спыніліся ў яе доме пасля рэйду ў тыл праціўніка і актыўна абмяркоўвалі з ім звязаныя падзеі з выкарыстаннем сапраўднай рускай гаворкі – мата. Камандзір байцоў насцярожана паставіўся да гаспадыні, што так прыслухоўвалася да размовы. У працэсе гутаркі высветлілася, што ягоная сястра была служкай дачкі ў Венцэносцава, бацька працаваў кучарам гаспадара, а самаму афіцэру ў юнацтве падабалася Лідзія Венцэносцава. Так і высветлілася, што гаспадыня Лідзія Пятроўна не шпіёнка. Знаёмы з дзяцінства рускі мат у той сітуацыі прагучаў для яе амаль як прыгожая музыка [3, арк. 5–29].

У час руху ў складзе 60-й арміі 1-га Украінскага фронту па вызваленых населеных пунктах В. Волчак назіраў “створаную вайной рэчаіснасць”: замест вуліц – суцэльныя калідоры руін, у дробных населеных пунктах – толькі рэшткі комінаў. Па словах архітэктара, адзіныя пачуцці, якія гэтыя відовішчы выклікалі ў салдат, – гнеў. Іншых слоў у роднай мове падабраць было немагчыма [1, арк. 3].

Пазней ён успамінаў: “Прафесія архітэктара з’яўляецца творчай і ствараючай. Яна стварае асяроддзе для паўсядзённага жыцця, працы і адпачынку чалавека. І гэтая прафесія знаходзіцца ў яўным супярэчанні з непазбежнай з’явай разбуральнай прыроды вайны. Для мяне як архітэктара было асабліва балюча бачыць разбуральную моц вайны”. Архітэктар успамінаў, што гэта раніла “прама ў сэрца”, бо вермахт не шкадаваў ні помнікі культуры, ні простыя хаты [1, арк. 38, 42]. Віктар Мацвеевіч прыгадваў словы свайго калегі ленінградскага архітэктара Л. Л. Шрэтэра: “Сэрца абліваецца крывёй даваць каманду «Агонь па Пецяргофу!». Толькі вайна магла зрабіць такое жахлівае выпрабаванне для архітэктара”.

Некаторыя гарады, на здзіўленне В. Волчака, засталіся амаль не пашкоджанымі. Франтавіку ўбачыць нармальныя вуліцы, плошчы і паркі ў 1944 г. было ўсё роўна, што прачнуцца ад жахлівага сну. Першым такім горадам быў Львоў, затым – Жэшуў, Тарнуў, Кракаў. Як прадстаўнік самай мірнай прафесіі архітэктара наш герой мог бы падумаць, што гэтыя гарады захавала для чалавецтва звышнатуральная сіла. Але як афіцэр-сапёр ён добра ведаў, што гэтая сіла – Чырвоная армія [1, арк. 1–7].

З матэрыялаў ваеннага часу ў фондзе В. М. Волчака захаваліся таксама шэсць франтавых лістоў да жонкі, франтавыя фотаздымкі архітэктара-мастака і яго аднапалчан за 1943–1945 гады.

У складзе фонду знаходзіцца некалькі варыянтаў нарыса "Эпізод з жыцця" пра сустрэчу з сябрам па вучобе Г. Заборскім у пачатку 1943 г. на канцэрце Ленінградскага сімфанічнага аркестра ў Чалябінску. Г. Заборскі далечваўся ў шпіталі пасля сур'ёзнага ранення і ўжо тады праектаваў помнік Перамогі ў Мінску, а В. Волчак прыбыў у горад са сваёй воінскай часткай на перафарміраванне пасля баёў пад Сталінградам. Віктара Мацвеевіча вельмі ўразіла асэнсаванне таго факта, што Г. Заборскаму аказалася дастаткова пачуць пра разгром Паўлюса пад Сталінградам, каб пачаць праектаваць помнік Перамогі ў Мінску. З гэтай нагоды В. М. Волчак здолеў дастаць для сябра пяць лістоў паперы [1, арк. 17–18; 4, арк. 1–5].

Аднойчы падчас інтэрв'ю на пытанне аб удзеле ў мемарыялізацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны заслужаны архітэктар БССР сказаў: "для мяне няма абстрактнага вобраза загінуўшага «невядомага салдата». Яго вобраз у маёй свядомасці зліўся ў абагульнены вобраз маіх загінуўшых сяброў і салдат, забітых падчас бамбёжак, артылерыйскіх налётаў на нашы пазіцыі, танкавых атак праціўніка. Памяць пра іх – гэта не загойная рана на маім сэрцы. Я архітэктар. І каму, як не мне, у першую чаргу актыўна ўдзельнічаць у мемарыялізацыі памяці пра загінуўшых" [1, арк. 32].

Адным з першых праектаў архітэктара В. Волчака па ўшанаванні гераізму ў баях за вызваленне Беларусі стала стварэнне музея-помніка ў населеным пункце Леніна Магілёўскай вобласці (1953). У БДАНТД захаваліся альбом з эскізамі праекта, альбом з фотаздымкамі пабудаванага помніка-музея, а таксама цэлы шэраг друкаваных крыніц – публікацыі агульнасаюзнай газеты "Известия" і айчыннай "Советская Белоруссия" (амаль на ўвесь нумар) аб адкрыцці помніка, буклет "Битва под Ленино" і выданне "Ленино – мемориал советско-польского боевого содружества" выдавецтва "Беларусь" на беларускай, польскай і рускай мовах [5; 6].

Паводле індывідуальных праектаў В. Волчака былі збудаваныя мемарыял на месцы лагера савецкіх ваеннапалонных у Масюкоўшчыне (шталаг 352), помнікі воінам Чырвонай арміі ва Уруччы, на бульвары імя Талбухіна ў Мінску, помнік на брацкіх магілах загінуўшым партызанам і савецкім воінам у г.п. Івянец Валожынскага раёна, мемарыяльныя знакі на месцах баёў і пахаванняў савецкіх патрыётаў і інш. [1 арк. 34–36].

У архіўных матэрыялах захаваліся некалькі фотаздымкаў за 1955–1958 гг. праекта помніка юнаму герою-партызану Марату Казею і дакументы да помніка, створанага В. Волчакам разам са скульптарам С.Селіханавым [7, арк.1–6; 8, арк. 1–6]. У іншую справу аб'ядналі артыкулы газет "Чырвоная змена" і "Знамя юности" аб адкрыцці помніка ў 1959 г. [9, арк. 3–4]. Захавалася і перапіска архітэктара з расійскімі школьнікамі, піянерская дружына якіх насіла імя Марата Казея [10, арк. 5–6]. Сярод матэрыялаў асабістага збора – варыянты помніка партызану К. Заслонаву ў Оршы [11], праект помніка

ў гонар вызвалення г. Магілёва [12], перапіска аб будаўніцтве помніка загінуўшым воінам Савецкай арміі ў г.п. Івянец, створанага разам са скульптарам Я. Печкіным [13].

Акрамя таго, у прыгаданым асабістым фондзе знаходзяцца дакументы перыяду канца 1950-х гадоў аб праектаванні філіяла Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Малы Трасцянец. Планавым заданнем прадугледжваліся 2 залы. Згодна з тэматычным планам у першай зале неабходна было абазначыць 2 тэмы – звярынае аблічча фашызму і гераічную барацьбу савецкага народа супраць захопнікаў. Другая зала па гэтым дакуменце распавядала б непасрэдна пра канцэнтрацыйны лагер у Трасцянцы. На абеліску, які быў запраектаваны, меркавалася размясціць вершаваныя радкі: “Мы – тысячы ахвяр, што ў полымя кастроў фашысты кінулі на трасцянецкім полі, звяртаемся да вас, сясцёр сваіх, братоў, змагайцеся за мір і беражыце волю!” [14, арк. 3–7; 15, арк. 1–9].

У рукапісах артыкулаў і творчых справаздач В. М. Волчака можна знайсці інфармацыю пра падрыхтоўку і стварэнне па праектах архітэктара мемарыяла на магілах ахвяр лагера ў Масюкоўшчыне і Уруччы [16, арк. 17–18], таксама змешчана планавае заданне на стварэнне мемарыяла.

Пэўны час М. В. Волчак працаваў дацэнтам кафедры малюнка Беларускага політэхнічнага інстытута. У матэрыялах асабістага збора ўтрымліваюцца крыніцы аб дзейнасці ў 1957 г. дацэнта В. М. Волчака па вывучэнні і абследаванні помнікаў воінам Савецкай арміі і партызанам [17, арк. 4–6]. Захаваўся ліст часова выконваючага абавязкі магілёўскага аблваенкама падпалкоўніка Літвінава бабруйскаму гарадскому і горацкаму раённаму ваенкамам аб неабходнасці садзейнічаць дацэнту В. М. Волчаку ў працы па вывучэнні і даследаванні помнікаў [18, арк. 4, 9]. Шматгадовая праца па мемарыялізацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, па вывучэнні і абследаванні помнікаў у розных рэгіёнах БССР знайшлі адлюстраванне ў творчай справаздачы архітэктара аб дзейнасці па ўшанаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну [16, арк. 1–20], артыкуле “Подзвіг народа бессмяротны” [19, арк. 5–12] і дакладзе “Ніхто не забыты, нішто не забыта”, падрыхтаваным В. М. Волчакам да 30-годдзя Перамогі [20, арк. 1–44].

У 1965 г. Полацкі гарадскі савет дэпутатаў звярнуўся ў БПІ з просьбай аб праектаванні помніка ў гонар вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў. Праект студэнтаў пад кіраўніцтвам В. М. Волчака стаў пераможцам сярод конкурсных работ, аб чым Віктар Мацвеевіч напісаў у артыкуле “Памяці герояў” для газеты “Савецкі інжынер” у красавіку 1966 г. [21, арк.1].

З 1954 г. Віктар Волчак пачаў працаваць над тэмай ушанавання гераізму абаронцаў Брэсцкай крэпасці. У 1955 г. ён наведаў крэпасць падчас знаходжання там пісьменніка С. Смірнова і застаўшыхся ў жывых абаронцаў знакамітай фартэцыі – П. Гаўрылава, Р. Абакумавай, П. Клыпы. А. Махнача і іншых [22, арк. 1–6]. Менавіта ў аўтографе гэтых успамінаў В. Волчак апісвае нечаканую сустрэчу П. Гаўрылава з сяброўкай сваёй першай жонкі. Жанчына паведаміла Герою Савецкага Саюза маёру П. Гаўрылаву, што яго

першая жонка перажыла вайну і знаходзіцца ў доме інвалідаў недалёка ад Брэста. Сустрэча з абаронцамі і іх аповед пакінулі ў архітэктара настолькі глыбокі след, што праца над помнікам героям Брэста стала для В. М. Волчака адказам на неабходнасць выказаць свае пачуцці мовай мастацтва. Гэтай тэме архітэктар прысвяціў 18 гадоў творчай дзейнасці. Віктар Мацвеевіч прыняў удзел ва ўсіх шасці конкурсах. У адным з першых конкурсаў ён адзіны з удзельнікаў не ўлічыў абавязковае патрабаванне ўзвесці манумент на цэнтральнай плошчы г. Брэста і прапанаваў яго паставіць манумент на крапасным вале. І з цягам часу менавіта ідэя размясціць помнік у самой крэпасці была прынята за аснову [16, арк. 12; 23, арк. 1–3.].

Віктар Волчак быў уключаны ў фінальны аўтарскі калектыў па праектаванні мемарыяльнага камплексу і на пэўны час стаў галоўным архітэктарам праекта «Брэсцкая крэпасць-герой», а затым ажыццяўляў аўтарскі нагляд за будаўніцтвам мемарыяла, адкрытага 25.9.1971 г.

Адметнай рысай асабістых архіўных фондаў з'яўляецца тое, што такія зборы ўтрымліваюць шырокі відавы і тэматычны спектр дакументаў і творчых матэрыялаў. Аб працы архітэктара В. Волчака па стварэнні мемарыяльнага коплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" у ягоным асабістым зборы ўтрымліваецца шмат крыніц, у тым ліку стэнаграма абмеркавання конкурсных праектаў Камісіяй ЦК КП(б)Б. Даследчыкі могуць азнаёміцца з тлумачальнай запіскай да праектнага задання аб стварэнні гарадка-музея і парка ў Брэсцкай крэпасці. У фондзе ёсць дакументы, датычныя Музея абароны Брэсцкай крэпасці. Свае ўспаміны аб працы над тэмай В. Волчак абагульніў у артыкулах "Два праекты помніка героям абароны Брэсцкай крэпасці" і "18 гадоў працы над адной тэмай". Гісторыкам і спецыялістам у галіне архітэктуры будзе цікава і карысна азнаёміцца са зробленым В. М. Волчакам аналізам асабістых конкурсных праектаў і агульнай характарыстыкай праектаў удзельнікаў рэспубліканскіх і агульнасаюзнага конкурсаў. У асобных папках сабраны фотаздымкі крэпасці да пачатку і на розных этапах стварэння мемарыяльнага комплексу, а таксама з цырымоніі адкрыцця мемарыяла. Акрамя таго, у фондзе знаходзяцца сабраныя архітэктарам матэрыялы СМІ аб гераічным подзвігу абаронцаў і стварэнні мемарыяла ў крэпасці.

Завяршаючы агляд дакументаў і матэрыялаў аб увасабленні ваеннай тэмы ў творчасці архітэктара-франтавіка В. М. Волчака, прыгадаем ягоныя словы з успамінаў: "Калі назаўсёды замаўчаць галасы ветэранаў вайны і ў тым ліку мой, за нас аб вялікім подзвігу народа будуць распавядаць будучым пакаленням помнікі. Значыць, будзе працягваць гучаць і мой голас" [1, арк. 33].

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД). – Ф. 81. (В.М.Волчек). Воп. 1. Спр. 21.

2. БДАНТД. – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 26.

3. БДАНТД. – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 1.
4. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 28.
5. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 101.
6. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 14.
7. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 10.
8. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 47.
9. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 100.
10. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 52.
11. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 9.
12. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 2. Спр. 12.
13. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 51.
14. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 50.
15. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 52.
16. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 17.
17. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 12.
18. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 49.
19. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 8.
20. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 16.
21. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 11.
22. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 24.
23. БДАНТД – Ф. 81. Воп. 1. Спр. 22.